■ Астравецкая пляцоўка

УСЕ БАКІ МІРНАГА АТАМА

НАПРЫКАНЦЫ сакавіка ў Астраўцы прайшло першае пасяджэнне аператыўнага штаба па будаўніцтве Беларускай АЭС. Перш чым узяцца за абмеркаванне рабочых пытанняў, службовыя асобы пабывалі ў царкве Святых апосталаў Пятра і Паўла, дзе быў адслужаны малебен за пачатак добрай справы.

Шэраг аб'ектаў вытворчай, жыллёвай, інжынернай і транспартнай інфраструктуры АЭС ужо ўведзены ў эксплуатацыю, а неўзабаве павінна распачацца работа на катлаване станцыі. Сёлета прадугледжана будаўніцтва сетак газа- і водазабеспячэння, каналізацыі, ачышчальных збудаванняў, бетонна-растворнай, арматурнай гаспадаркі, сталовай, офіса генпадрадчыка, да пачатку ацяпляльнага сезона — газавай кацельні... У гэтым артыкуле сабраны некаторыя «карцінкі» і меркаванні па тэме будаўніцтва АЭС і звязаных з гэтым перамен на Астравеччыне.

Інфармацыя без грыфа «сакрэтна»

У **рэдактара раённай газеты «Астравецкая праўда» Ніны РЫБІК** малая радзіма засталася ў чарнобыльскай зоне, і менавіта Астравеччына ў цяжкую часіну «прытуліла» яе да сябе.

— Калі мець на ўвазе будаўніцтва АЭС, да чаго сёння схіляецца грамадская думка ў раёне?

— У сваёй большасці, па нашых назіраннях, апытаннях, нейкіх нават бытавых стасунках, людзі зацікаўлены ў будаўніцтве станцыі. Таму што, калі глядзець на рэчы рэальна, у раёне, па вялікім рахунку, прамысловасці няма, а толькі сельская гаспадарка. І раней моладзь не імкнулася сюды ехаць, бо не бачыла перспектывы. Жыхароў станавілася ўсё менш. Людзі чакаюць пачатку будаўніцтва АЭС з надзеяй, што будзе праца, прыстойныя заробкі — не толькі на самой станцыі, але і на аб'ектах інфраструктуры. Я асабіста ведаю людзей, чые дзеці выбіраюць вучобу менавіта па такіх спецыяльнасцях, каб вярнуцца ў Астравец. Прычым з разлікам працаўладкавацца не толькі на будучай станцыі, а па розных іншых кірунках, звязаных з будаўніцтвам АЭС.

Вядома, ёсць і тыя, хто супраць будаўніцтва станцыі. Іх можна падзяліць на дзве катэгорыі. Невялікая частка — гэта, так бы мовіць, прафесійная апазіцыя. Яны заўсёды супраць усяго, што б ні рабіла ўлада. І ёсць людзі (у іх прысутнічае гэты «чарнобыльскі сіндром»), якія сумняваюцца: «Як яно будзе? А раптам...». Але ў апошнія гады была праведзена такая вялікая растлумачальная работа, што, мне здаецца, у тых, хто пабойваўся будаўніцтва АЭС, гэты страх сыходзіць.

Кампетэнтныя звесткі па тэме атамнай энергетыкі можна атрымаць, напрыклад, звярнуўшыся ў інфармацыйны цэнтр дырэкцыі будаўніцтва АЭС, які працуе ў Астраўцы.

— Кожны чалавек можа сюды зайсці, задаць пытанне і атрымаць адказ. Мы гатовы прыняць дэлегацыю з любога рэгіёна, прычым калі ёсць патрэба, то і ў выхадныя, — гаворыць **кіраўнік групы па інфармацыйнай рабоце ДУ «Дырэкцыя будаўніцтва атамнай электрастанцыі» Эдуард СВІРЫД.** — З кастрычніка 2009 года ў інфармацыйным цэнтры пабывала каля 4 тысяч чалавек, у тым ліку з Польшчы, Германіі, Японіі. Праўда, ні адзін з мясцовых праціўнікаў будаўніцтва АЭС тут не быў. Ім уласцівыя, як правіла, катэгарычнасць высноў (усё, маўляў, дрэнна і не можа быць ніякіх сумненняў) і адмова ад дыскусіі за адным сталом.

— Ці дапамагла растлумачальная работа змяніць сваё меркаванне тым жыхарам Астравеччыны, якія спачатку з апасеннем ставіліся да будаўніцтва АЭС?

— Некаторыя грамадзяне з аддаленых ад нас мясцін Беларусі ледзь не каля скроні пальцам круцяць: маўляў, вы там, у Астраўцы, агулам выступаючы за гэтую АЭС, недалёкія, тупаватыя, нічога не разумееце. Я на гэта адказваю, што мы больш «у тэме» мірнага атама, чым жыхары Гродна, Мінска і іншых рэгіёнаў. Мы больш інфармаваныя. І таму лухта, «страшылка» пра тое, што быццам у нас пабудуюць рэактар чарнобыльскага кшталту, як сказаў адзін з нашых апанентаў, ужо не пройдзе. Бо многія ведаюць, што тут будзе зусім іншая тэхналогія, чым у Чарнобылі і на Фукусіме. І тыя пытанні, якія могуць паўплываць на бяспеку, вырашаны ўжо на стадыі праекта.

Тэму ўмацавання даверу жыхароў раёна, ды і ўвогуле краіны, да будаўніцтва АЭС мы прадоўжылі падчас гутаркі з **Уладзімірам ГОРЫНЫМ, які працуе ў атамнай энергетыцы з 1979 года.** Пачынаў з рабочага, начальніка змены на Ровенскай атамнай станцыі, узначальваў хімічны цэх на Балакоўскай станцыі, цяпер — намеснік галоўнага інжынера Дырэкцыі будаўніцтва Беларускай АЭС.

Дарэчы, начальнік ідэалагічнага аддзела Астравецкага райвыканкама Аляксандр Клімчэня і Уладзімір Горын — у пэўным сэнсе калегі. З 2008 года, калі пачаліся размовы аб верагоднасці будаўніцтва на Астравеччыне атамнай электрастанцыі, яны разам з Эдуардам Свірыдам і іншымі пабывалі літаральна ў кожным населеным пункце раёна, выступалі ва ўсіх вытворчых калектывах, арганізацыях, школах. З'ездзілі таксама ў Пастаўскі, Мядзельскі, Ашмянскі, Смаргонскі раёны... Акрамя таго, для прадстаўнікоў грамадскасці была арганізавана паездка ў Санкт-Пецярбургскі інфармацыйны цэнтр «Расатама», плануецца і наведванне Калінінскай АЭС.

— Разам з мясцовай уладай мы з самага пачатку былі за адкрыты дыялог з людзьмі. Прычым не імкнуліся нешта ўпаіць, — кажа Уладзімір Горын. — Мяркую, што ў асноўным людзі нас разумеюць. Самая спрыяльная аўдыторыя — гэта, на маю думку, тыя, хто ў нечым сумняваецца. Чалавек задае пытанні, якія яго хвалююць, і атрымлівае інфармацыю, што дазваляе яму зрабіць нейкія высновы. А вось з тымі, хто не гатовы да дыялогу, размаўляць цяжка. Як ні дзіўна, катэгарычныя праціўнікі АЭС у дыялог не ўступаюць.

Дарэчы, цяперашні інфармацыйны цэнтр — гэта толькі пачатак. У перспектыве будзе створаны такі цэнтр, які дазволіць даведвацца аб рабоце станцыі ў рэжыме рэальнага часу — нагрузка, магутнасць, радыяцыйная сітуацыя... Ужо цяпер на Астравеччыне (Міхалішкі, Гервяты, Трокенікі-1) устаноўлены аўтаматычныя пункты вымярэння магутнасці дозы гама-выпраменьвання ў рэальным часе. Колькасць іх Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя плануе павялічыць да пятнаццаці. І яшчэ да пуску АЭС у Астраўцы і ў буйнейшых населеных пунктах раёна мяркуецца ўстанавіць электронныя інфармацыйныя табло з указаннем бягучага радыяцыйнага фону. Каб людзі маглі пераканацца, што ён не змяняўся з пачаткам эксплуатацыі атамнай электрастанцыі.

— Магчыма, з'явіцца і нейкія формы грамадскага кантролю за дзейнасцю АЭС, — не выключае Уладзімір Горын.

— А чаму не атрымліваецца дыялог наконт Беларускай АЭС з літоўцамі?

— Мы адказалі на ўсе пытанні суседзяў. Цяпер у іх адзін аргумент: навошта будуеце за 50 кіламетраў ад Вільнюса? Аднак мы самі вырашаем, дзе нам будаваць, і ні ў адным дакуменце МАГАТЭ ніякіх абмежаванняў па гэтым пытанні няма. На мой погляд, пазіцыя афіцыйнага Вільнюса тлумачыцца тым, што атамныя электрастанцыі, якія будуць пабудаваны на астравецкай пляцоўцы і ў Калінінградскай вобласці — гэта рэальныя канкурэнты магчымай Вісагінскай АЭС. Тым больш, што яна «спазняецца» ў параўнанні з намі і расіянамі. Дарэчы, апошнюю збіраюцца будаваць... за 2,5 кіламетра ад мяжы з Беларуссю, выкарыстоўваючы для станцыі ваду з памежнага возера Дрысвяты.

Выпрабаванне адказнасцю

Каб выключыць любыя фактары рызыкі, былі вывучаны 74 патэнцыйныя пляцоўкі для размяшчэння Беларускай АЭС. У выніку выбралі найлепшае месца з пункту гледжання геалагічных, гідралагічных, атмасферных і іншых фактараў. Але ёсць і яшчэ адна адметнасць, якая ўжо можа лічыцца фірменным знакам Астравеччыны: для большасці мясцовых жыхароў уваходзіць у звычку імкненне да парадку. Іх ужо не трэба, як калісьці, кантраляваць, прымушаць — ім самім падабаецца, каб усюды было чыста і ўтульна. Так, гэта важна найперш для саміх людзей. Але, разам з тым, арганічна спалучаецца і з найвышэйшым узроўнем парадку і адказнасці ў сферы атамнай энергетыкі. І ёй, напэўна, ужо не абысціся без астравецкіх кадраў.

Фотаздымкі Андрэя ПАМЕЦЬКІ.

— Падыходы да 1986 года і пасля адрозніваюцца кардынальным чынам, — падкрэслівае Уладзімір Горын. — Калі раней, дапусцім, маглі адразу ж накіраваць чалавека на выкананне нейкай работы, то цяпер такое немагчыма ў прынцыпе. Работнік павінен прайсці падрыхтоўку, здаць экзамены, і толькі потым ён атрымае доступ да самастойнай працы. І чым вышэй спецыяліст падымаецца «па службовай лесвіцы», тым больш патрабаванняў да яго прад'яўляецца. Трэба пастаянна вучыцца, працаваць над сабой, здаваць экзамены. Здаў экзамен — працягваеш работу, не здаў — вольны.

У тым, што з атамнай энергетыкай не жартуюць, можна пераканацца ўжо цяпер, на будаўніцтве аб'ектаў інфраструктуры АЭС. Прадстаўнікі генпадрадчыка (расійскае ЗАТ «Атамстройэкспарт») караюць штрафнымі санкцыямі нават за курэнне ў неналежным месцы, прычым не самога работніка, а яго арганізацыю.

Дарэчы, на пасяджэнні штаба па будаўніцтве АЭС **дырэктар генпадрадчай інжынерынгавай кампаніі Валерый ЛІМАРЭНКА** паведаміў, што нейкая спецыяльная будаўнічая арганізацыя стварацца не будзе — паколькі адсутнасць канкурэнцыі расхалоджвае. Аб'ёмы работ атрымаюць на конкурснай аснове тыя, хто дакажа, што здольны працаваць у патрэбным тэмпе і з належнай якасцю. Прычым беларускія арганізацыі, у якіх няма вопыту будаўніцтва АЭС, будуць вучыцца не на астравецкай пляцоўцы, а падчас папярэдняй стажыроўкі на расійскіх станцыях.

Выпрабаванне адказнасцю маштабных задач праходзіць цяпер на Астравеччыне і мясцовая ўлада. Прычым задачы ў яе, можа, нават больш складаныя, чым у будаўнікоў. За прафесіяналаў, для якіх вызначаны крыніцы фінансавання, перажываць не трэба. А вось ці ўсё прадугледжана ў плане комплекснага развіцця Астравецкага краю? Ці будзе адпавядаць патрабаванням горада энергетыкаў сацыяльная сфера?

Што датычыцца карысці праекта будаўніцтва АЭС для мясцовых жыхароў, то **старшыня Астравецкага райвыканкама Адам КАВАЛЬКА** ўжо сёння прыводзіць канкрэтны прыклад. У мікрараёне №1 з дапамогай Дырэкцыі будаўніцтва АЭС пракладзены водаправодныя, каналізацыйныя сеткі, газаправод, пабудаваны трансфарматарныя падстанцыі — пляцоўка цалкам падрыхтавана пад усю інфраструктуру. Там размешчаны чатыры кааператыўныя жылыя дамы, і для кожнага забудоўшчыка, вядома ж, больш выгадна, калі ўжо ёсць камунікацыі.

На аб'ектах вытворчай і жыллёвай інфраструктуры; інфармацыйны цэнтр АЭС.

«Кадравыя» пытанні

Сёлетняй восенню на пляцоўцы АЭС будуць заняты больш за 2 тысячы работнікаў, а ў 2014 годзе іх колькасць павялічыцца да 7—8 тысяч. Плюс будаўнікі горада энергетыкаў. У сувязі з гэтым, зразумела, ёсць праблемы літаральна ва ўсіх сферах абслугоўвання людзей. Цяпер праводзіцца рэканструкцыя ўбойнага і каўбаснага цэхаў спажыўкааперацыі, неўзабаве пачнецца мадэрнізацыя хлебазавода. Раённыя ўлады разлічваюць і на інвестараў, запрашаючы іх да будаўніцтва прадпрыемстваў гандлю, грамадскага харчавання, цэнтра па аказанні клінінгавых паслуг, птушкафабрыкі, комплексу прыдарожнага сэрвісу, цяплічнага камбіната і іншых аб'ектаў. Зацікаўленасць бізнэсу ёсць. У прыватнасці, турэцкая фірма будзе будаваць гасцініцу, з шэрагам прапаноў нядаўна прыязджала група літоўскіх прадпрымальнікаў. А кошт зямельнага ўчастка плошчай у 1 гектар пад будаўніцтва гандлёвага цэнтра падняўся на аўкцыёне з 12 да 962 мільёнаў рублёў.

Куды больш складана з сацыяльнай часткай інфраструктуры, якая ўваходзіць у праект будаўніцтва АЭС у асноўным чыста намінальна, у арганізацыйным, а не фінансавым парадку. А закладзенымі бюджэтнымі сродкамі своечасова вырашыць праблему, напрыклад, з недахопам месцаў у дзіцячых садках (сёння яны ў Астраўцы перапоўнены, а каля 30 дзяцей сядзяць па дамах) альбо з будаўніцтвам установаў адукацыі і аховы здароўя, вельмі складана. Менавіта своечасова, каб не адстаць ад каласальнага павелічэння колькасці насельніцтва ў горадзе энергетыкаў і не выклікаць сацыяльнай напружанасці.

Прычым важна паклапаціцца не толькі аб канкрэтных аб'ектах, але і аб забеспячэнні іх кадрамі. У прыватнасці, расіяне запатрабавалі, каб на будоўлі АЭС пастаянна дзяжурыла машына хуткай дапамогі. Аднак на тры «карэты» ў Астраўцы — ніводнага ўрача, а толькі фельчары. А ўвогуле ў раённай медыцынскай службе — 17 урачэбных вакансій. Гэта і сёння праблема. А заўтра?

Альбо такое пытанне: як адаб'ецца будаўніцтва АЭС на мясцовым рынку працы?

— Так, мы чакаем, што заробкі на будаўніцтве аб'ектаў інфраструктуры і самой станцыі будуць непараўнальныя з тымі, што ёсць на існуючых прадпрыемствах. Таму трэба захаваць кадры, і перш за ўсё на вёсцы, — адзначае Адам Кавалька. — Я лічу, што тэхніка, сучасныя тэхналогіі ў жывёлагадоўлі дазваляюць працэнтаў на 20-30 скараціць кадравы склад занятых у сельскагаспадарчай вытворчасці. Ды і ў «канторах» трэба людзей скарачаць. Аднак, каб лепшыя там усё ж засталіся, трэба павялічваць зарплату, што дасягаецца ростам вытворчасці і скарачэннем выдаткаў. Мы над гэтай праблемай працуем.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■ Можна, калі асцярожна

ЁСЦЬ ТАКАЯ ПАТРЭБА...

У бліжэйшай будучыні чалавецтва наўрад ці зможа адмовіцца ад атамнай энергетыкі. Эканоміка шматлікіх краін вельмі моцна завязана на працы АЭС, таму ліквідаваць іх немагчыма, асабліва ў такіх дзяржавах, як Францыя, Канада і інш. У прагнозе развіцця сусветнай энергетыкі, падрыхтаваным Міжнародным энергетычным агенцтвам, гаворыцца, што доля атамнай генерацыі ў агульнасусветнай выпрацоўцы электраэнергіі вырасце да 2035 года на 70%.

Цэлы шэраг вядучых дзяржаў прызналі, што яны маюць вострую патрэбу ў атамнай энергетыцы. Так, у Францыі была праведзена праверка ўсіх АЭС, але ні адна з іх не была закрыта. Нядаўна прэзідэнт Францыі Нікаля Сарказі выказаў намер запатрабаваць ад аператараў падаўжэння тэрміну эксплуатацыі рэактараў да 40 гадоў. Рэкамендацыі аб падаўжэнні службы АЭС былі дадзены ўрадавай камісіяй Францыі, у дакладзе якой падкрэслена, што для краіны гэта будзе разумным зберажэннем сродкаў. Больш за тое, плануецца будаўніцтва новага рэактара для АЭС Penly на поўначы Францыі, а таксама распрацоўка рэактараў чацвёртага пакалення.

У ЗША 9 лютага гэтага года Камісія па ядзерным рэгуляванні ўхваліла будаўніцтва новых атамных рэактараў. Гэта адбылося ўпершыню за апошнія 30 гадоў.

Паказальным для Францыі і іншых краін Еўропы стаў прыклад Германіі, якая, прыняўшы паспешлівае, палітычна матываванае рашэнне аб закрыцці некалькіх АЭС, ва ўмовах анамальна нізкіх тэмператур мінулай зімы была вымушана падключаць рэзервовыя магутнасці.

Тым не менш, казаць аб тым, што ва ўсім свеце стаўленне да атамнай энергетыкі станоўчае, вядома, нельга. У першую чаргу гаворка ідзе аб Японіі, дзе жыхары па-ранейшаму знаходзяцца ў страху. Цяпер у Японіі дзейнымі з'яўляюцца толькі тры з 54 атамных рэактараў. Але нават там, нягледзячы на аварыю, не змогуць адмовіцца ад атамнай энергетыкі, кажуць эксперты.

Вядома, акрамя эканамічных момантаў, вельмі важным з'яўляецца і экалагічны аспект. Па вялікім рахунку, АЭС, калі яны надзейна абаронены, не даюць ніякіх выкідаў, у адрозненне ад традыцыйных крыніц энергіі, сцвярджаюць вучоныя. На іх думку, зараз будуюцца больш абароненыя, надзейныя станцыі, а ахоўныя механізмы ўдасканальваюцца з кожным годам.

Святлана БУСЬКО

Лепшыя крамы, нізкія цэны

«Крама ўзорнага парадку» — такі статус атрымала 5 гандлёвых аб'ектаў у Магілёве. Паводле ініцыятывы абласной улады, гэтыя крамы адзначаны спецыяльнымі лагатыпамі.

Начальнік упраўлення гандлю і паслуг Магілёўскага аблвыканкама Алег БУЯНАЎ уручыў кіраўніцтву лепшых крам дыпломы «За бездакорную працу і высокую культуру абслугоўвання». Ганаровае званне даецца камісіяй на каляндарны год, і яго, падкрэсліваюць ва ўпраўленні гандлю, трэба заслужыць, даказаць справай.

— Крама ўзорнага парадку — не той аб'ект, дзе шэсць разоў на дзень падмятаюць і мыюць падлогу, — сказаў Алег Буянаў журналістам. — Там заслугоўвае павагі і з'яўляецца прыкладам для перайманння арганізацыя працоўнага працэсу.

Ацэньваліся найперш сучасныя падыходы ў гандлі, камп'ютарная сістэма ўліку, культура абслугоўвання, шырыня асартыменту, праграма лаяльнасці да сацыяльна неабароненых катэгорый пакупнікоў.

Упраўленне гандлю працуе і з крамамі, якія не маюць добрага выгляду, не клапоцяцца пра кліентаў. «Аднак самае суровае пакаранне для іх — адсутнасць пакупніка», — сказалі на прэс-канферэнцыі. Дзейнічае ў рэгіёне і сістэма спажывецкага кантролю: знайшоў у краме сапсаваны прадукт, у якога скончыўся тэрмін прыдатнасці, — атрымай падобны, толькі добрай якасці.

Кіраўніцтва сферы гандлю вобласці таксама запэўніла, што сёння няма падстаў для росту цэн на малако і мяса ў рэгіёне. У продажы хутка з'явіцца танны сланечнікавы алей бабруйскай вытворчасці: бутэлька, абяцаюць, будзе каштаваць менш за 13 тысяч рублёў. «Пакупніка трэба здзіўляць нізкімі цэнамі», — заявіў Алег Буянаў.

Ілона ІВАНОВА.

■ Ну і ну!

Сагнаў карэту хуткай дапамогі

Жыхар Віцебска сагнаў машыну хуткай неадкладнай дапамогі. А трэцяй гадзіне ночы ў раёне аўтавакзала, каля будынка Віцебскай гарадской станцыі хуткай і неадкладнай дапамогі па вуліцы Касманаўтаў злодзей залез у незамкнутую аўтамашыну. Ключы былі пакінуты ў замку запальвання. Ужо хвілін праз 30 згоншчыка «хуткай» затрымалі. Аддзелам следчага камітэта заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

БЕЛАРУСКАЯ ЦЭГЛА ДЛЯ ВЕНЕСУЭЛЬСКІХ НОВАБУДОЎЛЯЎ

У пачатку красавіка беларускі завод будаўнічых матэрыялаў у Венесуэле пачаў выпускаць сваю першую прадукцыю. Пакуль што канвеер працуе ў тэставым рэжыме, але ў бліжэйшы час ён наросціць сваю магутнасць, каб вырабляць 125 тысяч тон гатовай прадукцыі за год.

Карэспандэнт «Звязды» пабываў на сумесным беларуска-венесуэльскім прадпрыемстве і на свае вочы пабачыў, як інтэрнацыянальны калектыў рыхтуецца да здачы пад ключ самага буйнога ў Лацінскай Амерыцы прадпрыемства такога профілю.

ДЗЕ РАНЕЙ ПАНАВАЛІ ДРАПЕЖНІКІ

Сёння стала рэальнасцю тое, што яшчэ ў лістападзе 2009 года мне здавалася вельмі далёкім.

Сябры-землякі прывезлі мяне на аб'ект, дзе панавалі непразlaсныя зараснікі калючых раслін. З усяго жывога я заўважыў толькі гіганцкую ігуану і грымучую змяю cascabel. У небе луналі грыфы, якіх тут называюць «самура». Да поўнага спісу драпежнікаў не хапала толькі тыгра-людаеда, зубастага каймана і крыважэрных абарыгенаў з мачэтэ. Пра апошніх я пажартаваў дарма. Нам насустрач кінуліся перапалоханыя ахоўнікі:

— Сеньёры, вам трэба быць пільнымі! Сёння ўначы маландрасы прыгналі сюды скрадзены аўтамабіль, знялі з яго ўсё каштоўнае, а затым спалілі.

Венесуэльскія апалубшчыкі-бетоншчыкі.

«Маландрасамі» ў Венесуэле называюць зладзеяў, для якіх абрабаваць і нават забіць чалавека — справа адной хвіліны. Яшчэ «маландрасы» крадуць людзей з мэтаю атрымаць выкуп. А каб паскорыць працэс, адсякаюць палец.

Так што, перш за ўсё сябры-землякі папярэдзілі мяне пра паводзіны пры абрабаванні. Пасля інструктажу я адважыўся ўскараскацца на высачэзны ўзгорак з пяску і глею, каб зрабіць першае гістарычнае фота. На пустцы, якая раскінулася ўздоўж шашы, беларусы мусілі пабудаваць завод, які на той час атрымаў працоўную назву — цагельня.

Зверху адкрыўся цудоўны гарысты пейзаж, у вушах звінела ад цішыні. Але хутка цішыню тут парушыць рык бульдозераў і самазвалаў.

ХРОНІКА БУДАЎНІЦТВА

2009 год. Дэфіцыт жылля ў Венесуэле вымушае ўрад стварыць мегапрадпрыемства па вытворчасці цэглы і іншых будаўнічых матэрыялаў. Будаўніцтва завода даручаецца навастворанаму сумесному беларуска-венесуэльскаму прадпрыемству Vemproimco S.A. Пачынаецца распрацоўка тэхналагічнай дакументацыі.

Месца для будаўніцтва завода выбралі невыпадкова. Паміж Гватырэ і Гварэнасам, гарадамі-спадарожнікамі Каракаса, знаходзіцца буйное радовішча гліны, якое дазволіць заводу працаваць на мясцовай сыравіне не менш за 20 гадоў.

2010 год. Пачатак праектных і агульнабудаўнічых работ. Першы этап (земляныя работы) цягнуўся больш года. Падчас яго было перамешчана больш за мільён кубаметраў грунту. У прэс-рэлізе прадпрыемства названа дакладная лічба — 1 150 000 м³ і тут жа дадзена: «гэтага аб'ёму хопіць, каб засыпаць даверху чашу футбольнага стадыёна Уэмблі ў Лондане».

Побач з асноўным аб'ектам вырастае перасоўны «гарадок» з пяці вагончыкаў для інжынерна-тэхнічнага персаналу. Тут ёсць усё патрэбнае для працы і адпачынку: інтэрнэт, офіснае абсталяванне, сталовая, душавыя і нават... лазня.

У тым жа годзе будоўля атрымлівае з Беларусі кар'ерную і аўтамабільна-грузавую тэхніку — 133 адзінкі самазвалаў «МАЗ», «МЗКЦ» і франтальных пагрузчыкаў «Амкадор».

Наступным этапам стала ўзвядзенне металічных канструкцый, агульная вага якіх складала каля паўтары тысячы тон.

Будаўніцтва глінасховішча.

Адбываецца асвячэнне будоўлі праваслаўным свяшчэннікам — айцом Паўлам Волкавым, настаяцелем храма св. Мікалая Мірлікійскага ў Каракасе.

Адначасова будаваўся АБК — адміністрацыйна-бытавы комплекс. Тут размяшчаецца венесуэльскі персанал, які будзе кіраваць заводам пасля ад'езду беларусаў. А пакуль венесуэльцы пераймаюць наш вопыт, ладзяць прэс-канферэнцыі, ініцыююць дабрачынныя акцыі для тутэйшага насельніцтва і выдаюць малатыражны бюлетэнь на іспанскай мове.

Прэзідэнт беларуска-венесуэльскага прадпрыемства Карла Фермін на сустрэчы з журналістамі не хавае свайго задавальнення ходам работ: «Закончана ачыстка ад дрэў першых 10 гектараў. Запасы сыравіны складаюць 8 мільёнаў тон. Магутнасць завода разлічана на вытворчасць 25 мільёнаў цагляных блокаў у год, што ў сваю чаргу дазволіць пабудаваць не менш за 11 тысяч кватэр плошчай 100 м кв. кожная».

Тым часам пачынаецца пастаўка тэхналагічнага абсталявання для вытворчай лініі. Галоўная адметнасць гэтага этапа работ — упершыню ў гісторыі Венесуэлы тут выкарыстаны беларускі прынцып паралельнага праектавання і будаўніцтва.

2011 год. Завяршэнне будаўніцтва галоўных карпусоў. Пачатак мантажных і пусканаладачных работ.

У маі мінулага года мяне запрасілі на аб'ект зрабіць незвычайную фотасесію. Трэба было сфатаграфаваць брак венесуэльскіх субпадрадчыкаў. Справа аказалася не з лёгкіх — фатаграфаваць недахопы значна цяжэй, чым дасягненні і поспехі.

Беларускае кіраўніцтва падало справаздачу ў адпаведную венесуэльскую інспекцыю, бо субпадрадчык адмаўляўся перарабляць дрэнна выкананую працу. А вы як думалі? Любая сур'ёзная будоўля не абыходзіцца без працоўных канфліктаў і спрэчак.

Дзякуй Богу, на нашым аб'екце іх было няшмат. Увогуле на аб'екце працавалі грамадзяне розных краін — Венесуэлы, Беларусі, Украіны, Расіі, Італіі і нават Літвы. Тут не здарылася ніводнага буйнога надзвычайнага здарэння, хоць цяжкасцяў і праблем хапала. За тры гады сумеснай працы калектыў згуртаваўся настолькі, што здаваўся мне агульнай сям'ёй.

Самы буйны ў Лацінскай Амерыцы завод будаўнічых матэрыялаў, красавік 2012 г.

ПАСТСКРЫПТУМ, АБО БЕЛАРУСКІ ЎКЛАД У БАРАЦЬБУ З ВЕНЕСУЭЛЬСКІМ БЕСПРАЦОЎЕ

Згодна з тэхпашпартам аб'екта, венесуэльскі кадравы састаў для абслугі здадзенага завода павінен будзе складаць 148 чалавек. Але колькасць працоўных месцаў павялічылі да 240. Так, ідучы насустрач пажаданням венесуэльскага боку, беларусы наўпрост паўдзельнічалі ў «Нацыянальнай праграме па стварэнні новых працоўных месцаў».

Ускосна ж наш унёсак значна большы — павелічэнне вытворчасці будаўнічых матэрыялаў у маштабах Венесуэлы на справе прывядзе да стварэння тысяч і тысяч новых працоўных месцаў.

Андрэй СМІРНОЎ, фота аўтара.

Каракас — Мінск, спецыяльна для «Звязды».